ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 42 (1009) | ЧАЦЬВЕР, 20-га лютага 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Узмацніць работу сярод батрацкай і бядняцкай моладзі

„Колектывізаваць да 1931 г. усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі Беларусі і поўнасьцю ліквідаваць кулацтва, як клясу немагчыма без мобілізацыі батрацка-бядняцкіх мас на выкананьне гэтых задач, без узмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку і ўсямернага разгортваньня работы па самастойнай організацыі беднаты і батрацтва, без узмацненьня палітычнай ролі батрацтва і беднаты як адзінай асноўнай апоры партыі на вёсцы“ (З пастановы ЦК КП(б)Б).

Зусім зразумела, што найбольшая і найлепшая організаванасьць батрацтва і беднаты ў саюзе з серадняцтвам ёсьць лепшы заклад пасьпяховага руху па шляху суцэльнай колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Надзвычайна вялікую ролю адыгрывае работа сярод беднаты і батрацтва ўнутры колгасаў. Організацыяй колгасаў і раскулачваньнем у нас яшчэ ні ў якім разе не зьнімаецца з парадку дню пытаньне „хто каго“. Кулацкія настроі, дробна-уласьніцкая ідэолёгія маюць свае праявы і ў колгасах. Кулацкім спробам падарваць колгас з сярэдзіны павінна быць супроцьпастаўлена організаванасьць батрацка-бядняцкага блёку ўнутры колгасаў.

Бедната і батракі павінны займаць пераважнае месца ў кіруючых органах колгасаў.

Зусім бясспрэчным зьяўляецца тое, што ўдзел комсамолу ў правядзеньні колектывізацыі немагчым без поўнай мобілізацыі мас батрацка-бядняцкай моладзі на справу ўдзелу ў вырашэньні задач колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы. Пайсьці на шляху ігнараваньня батрацка-бядняцкай моладзі, гэта значыць пайсьці па прастому шляху скатваньня ў опортуністычнае балота.

„Толькі чужыя партыі і комсамолу элемэнты могуць ігнараваць гэтую каранную задачу партыі — задачу самастойнай організацыі беднаты і батрацтва на вёсцы“.

Трэба прызнаць, што на сёньняшні дзень у шэрагу комсамольскіх організацый наглядаюцца моманты недаацэнкі палітычнай сутнасьці працы з батрацка-бядняцкай моладзьдзю, даходзячы ў шэрагу выпадкаў да простага ігнараваньня задач аб рабоце з беднатой і батрацтвам.

Ня так даўно на старонках „Чырвонай Зьмены“ быў зьмешчаны матар'ял аб становішчы Тураўскай організацыі ЛКСМБ, дзе па шэрагу фактаў даводзілася опортуністычная лінія райкому і ячэек комсамолу. Раён зараз суцэльна колектывізаваны. **Але як у момант правядзеньня колектывізацыі, так і зараз райком і ячэйкі не праводзілі і не праводзяць ніводнага сходу батрацка-бядняцкае моладзі.**

У момант жорсткай клясавай барацьбы, шэраг ячэек аказваюцца ня толькі палітычна сьляпымі ня толькі не організуюць батрацка-бядняцкую моладзь на барацьбу з кулаком, але і самі ня рэдка ня ідуць у колгас і нават часта патакаюць кулаку.

Замест працы сярод батрацтва шэраг комсамольскіх ячэек і райкомаў задаволена констатуюць, што ёсьць шмат батракоў у колгасах. Аднак эканомічна выхаваўчай работы сярод батракоў не вядуць.

Такія факты прымушаюць нас ва ўпор паставіць пытаньне перад камітэтамі аб праверцы стану і наладжаньня працы з бядняцкай і батрацкай моладзьдзю ў адпаведнасьці з рашэньнямі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Работа комсамолу з бядняцкай і батрацкай моладзьдзю ў тых мясцох, дзе слаба разьвіты колгасны рух павінна ісьці па лініі максымальнага згуртаваньня бядняцка-батрацкай моладзі вакол комсамолу на справу правядзеньня колектывізацыі, ліквідацыю кулацтва, як клясы, на справу рашучай барацьбы з кулацкімі манэўрамі—разбазарваньнем маёмасьці, агітацыяй і інш.

Гэтыя задачы павінны знайсьці сваё практычнае праламленьне пры правядзеньні асобных сходаў і конфэрэнцыі батрацка-бядняцкай моладзі і іншых правадзімых мерапрыемстваў.

На пытаньне, як павінна організоўвацца праца з беднатой і батрацтвам пры суцэльнай колектывізацыі зусім чоткі адказ сформуліраваны ў пастанове ЦК УсеКП(б). **Узмацненьне батрацка-бядняцкіх груп, скліканьне іх нарад і конфэрэнцый зьяўляецца грунтоўнай задачай партыі і комсамолу». Асноўныя назначэньні гэтых груп,**—пішацца ў пастанове ЦК—**быць дапаможнымі органамі партыйных організацый у справе разгортваньня масавай работы сярод беднаты, без чаго немагчыма забесьпячэньне інтарэсаў бядняцкіх колаў у колгасным будаўніцтве“.** Батрацтва і бедната зьяўляюцца грунтоўнай апорай партыі ўнутры колгасу. І таму зусім зразумелым зьяўляецца задача комсамолу па дапамозе партыі ў **замацаваньні у колгасах батрацка-бядняцкага ядра.**

Гэтага нельга вырашыць без прыцягненьня батрацтва і беднаты да актыўнага ўдзелу ва ўсім грамадзкім і палітычным жыцьці колгасаў, для барацьбы з дробна-буржуазнымі, дробна-уласьніцкімі настроямі.

Праз правядзеньне асобных нарад і сходаў бядняцкай і батрацкай моладзі трэба дабіцца, каб гэтая моладзь была сапраўдным застрэльшчыкам у соцыялістычным спаборніцтве. Патрэбна каб батракі і бедныкі ў першую чаргу былі організатарамі асобных галін, кіраўнікамі каля машын.

Клопаты комсамольскіх ячэек павінны ісьці па лініі эканамічнага забесьпячэньня батрацка-бядняцкай моладзі.

Усе эканамічна-бытавыя мерапрыемствы павінны знайсьці свой адбітак у працы ячэек. Слабая ўвага гэтым пытаньням найчасьцей прыводзіць да выхаду з колгасаў менавіта батрацкай і бядняцкай моладзі, як менш матар'яльна забясьпечанай.

У правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў зараз асаблівая ўвага павінна быць аддана асобнай працы з дзяўчатамі. Рост за лік дзяўчат батрачак і бядначак гаворыць за тое што гэта яшчэ закінуты вучастак працы.

Усе гэтыя задачы павінны быць самым цесным чынам зьвязаны з усямерным разгортваньнем палітычнага выхаваньня батрацка-бядняцкай моладзі.

Комсамольскія ячэйкі павінны зараз у парадак дню работы паставіць пытаньне аб організацыі працы ў колгасах, шырока прыцягваючы да вырашэньня гэтых пытаньняў батрацка-бядняцкаю моладзь.

Жорсткія барыкадныя баі ў Гішпаніі

Кулямётны агонь паліцыі ня можа спыніць штурмавых выступленьняў баявых пролетарскіх колён

Шматтысячныя пролетарскія атрады гэроічна выступаюць на барацьбу супроць фашызму

БЭРЛІН, 18. Як паведамляе «Ротэ Фанэ» у Мадрыдзе і іншых гарадох Гішпаніі 14 лютага ў сувязі з дэмонстрацыямі працоўных адбываліся жорсткія вулічныя баі. Ня гледзячы на забараненьне дэмонстрацыі, у Мадрыдзе дэмонстравалі тысячы працоўных. Дэмонстранты штурмавалі шэраг фабрык, прычым рабочыя гэтых фабрык кідалі работу і далучаліся ад дэмонстрацый. Асабліва жорсткі бой разгарэўся ў аднэй табачнай фабрыцы. Урад абвясьціў Мадрыд на асадным становішчы. Усе стратэгічныя пункты, грамадзкія памяшканьні і вулічныя скрыжаваньні былі заняты пяхотаю, узброенай кулямётамі і ручнымі гранатамі. У шмат якіх мясцох дэмонстранты прарвалі паліцэйскія цэпі. З выкрыкамі „работы і хлеба“, тысячы дэмонстрантаў накіраваліся з чырвонымі сьцягамі да каралеўскага палацу. На спробы дэмонстрантаў штурмаваць палац, ахрана адказвала кулямётным агнём. Адступіўшы спачатку, дэмонстранты аднаўлялі штурм палацу. Былі пабудаваны барыкады, пад прыкрыцьцем якіх дэмонстранты абараняліся булыжнікамі і ўсім, чым не папала. Баі працягваліся да позьняй ночы. Ранена шмат рабочых. Дваццаць паліцэйскіх былі цяжка ранены. У рабочых кварталах Мадрыду таксама ішлі барыкадныя баі, якія працягваліся да раніцы. Паведамляюць таксама аб жорсткіх баёх у шэрагу іншых провінцыяльных гарадоў. У Сагунто рабочыя чыгуначных майстэрняў абвясьцілі генэральную забастоўку, патрабуючы павышэньня заработнай платы і скарачэньня працоунага дню. У горадзе абвешчана асаднае становішча. З раніцы 15 лютага ідуць жорсткія вулічным баі. Большасьць рабочых узброена.

Беспрацоўныя аўладалі вуліцай

(З лейпцыгскай комуністычнай газэты „Саксонская Рабочая Газэта“)

... Учора дэмонстраваў лейпцыгскі пролетарыят. Ён сабраўся для выступленьня супроць прадпрыёмцаў і іхніх прыслужнікаў. Тыя 5 тысяч, якія ўчора прайшлі па вуліцах, прыдуць ізноў. Але яны з сабой прывядуць тысячы другіх, якія покуль стаяць у баку, якія жывуць у голадзе і ў роспачы, але яшчэ ня ведаюць дарогі да рэволюцыйнай барацьбы.

Узрастае армія клясава-сьвядомых змагароў. Усё больш і больш іх лік, усё болей і болей моцныя і зьядналыя іх выступленьні. Ніякія хлусьлівыя прамовы соцыял-фашыстых і нацыяналістых ня могуць іх спыніць. Усё больш шчыльным робіцца рэволюцыйны фронт і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі масы пайдуць наперад да лепшай соцыяльнай будучыні.

У пятніцу ізноў будуць дэмонстраваць беспрацоўныя—армія абяздоленых, армія выкінутых з працэсу вытворчасьці. Разам з фабрычнымі рабочымі яны выкінуць сваё моцнае патрабаваньне **работы і хлеба, яны заявяць і аб сваёй волі змагацца супроць галоднай дыктатуры буржуазіі і яе дзяржаўнага гвалтоўнага апарату.**

Антысавецкія выпады польскага друку

ВАРШАВА, 19. Антысавецкае цкаваньне ў Парыжы, якое ўвесь час працягваецца і выступленьне Ватыкана ўзьнялі на ногі таксама і польскія мілітарыстычныя колы. Орган консэрватараў, які ўваходзіць у склад урадавага блёку, „Дзень Польскі“ выступае ў перадавой, у якой касьцельныя благаўздыханьні зьмешваюцца з жаргонам зладзейскай «маліны». „Дзень Польскі“ заяўляе, што эўрапэйская грамадзкая думка пачынае абурацца супроць далейшага падтрыманьня адносін з бальшавікамі. «Польшча, якая знаходзіцца больш усяго пад пагрозай, павінна першая адгукнуцца на адозву папы, памятуючы аб сваёй традыцыі аховы хрысьціянскай цывілізацыі. **Польшча павінна стварыць антысавецкі ідэёва - рэлігійны фронт“.**

Органу зямельнага магната, страціўшага на савецкай Украіне некальні сот тысяч гэктараў зямлі падтакае кракаўскі «Кур'ер ілюстраваны», „Кур'ер Паранны“, „Рэч Паспаліта“ і інш. газэты Кракаўскі „Кур'ер ілюстраваны“ гаворыць, што паміж Эўропай і СССР існуюць адносіны нябачаныя ў гісторыі сьвету. Эўропа ня можа прымірыцца з такім становішчам. Выступленьне Эўропы супроць СССР пачынае набываць рэальныя формы. З усходу на Эўропу насоўваецца бура. Эўропа адказвае зацягваньнем вакол СССР свайго магутнага кола. Асноўная думка антысавецкіх выступленьняў польскага друку зводзіцца да наступнага: у бліжэйшыя часы трэба чакаць разрыву дыплёматычных адносін з Францыяй і Англіяй. У падзеях, якія надыходзяць, Польшча ня толькі не павінна заставацца з-заду, але наадварот, павінна іграць перадавую ролю.

«Кур'ер Паранны» сваю перадавую заканчвае словамі, набраныя курсівам: **„З усёй адказнасьцю за свае словы мы можам сьцьвярджаць, што асноўны пералом у СССР надышоў. Ня выключана, што ён адбудзецца ў працягу** бліжэйшых двух год. Польшча павінна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на Усход“.

Фронт пашыраецца

Старая Эўропа занепакоена.

За апошнія часы нават самыя трусьлівыя газэткі, якія выдаюцца за рубяжом, набываюць надзвычайна разьвязны і „харобры“ тон. Рэкорд устаноўлены пакуль францускім друкам.

Дзікай і пісклівай брахнёй заліваюцца буржуазныя і белагвардзейскія газэты Парыжу. Гаўкаюць гулка і раскаціста ангельскія догі, толькі выпадкова імянуемыя друкам. З-за акіяну даносіцца да Эўропы моцная і хрыплая брахня буйных капіталістычных псоў. САВЕЦКІ САЮЗ АБКРУЖАН ЦЭЛАЙ ЗГРАЯЙ ДВАРНЯЖАК, ЯКІЯ З РЭВАМ І ШАЛЕНСТВАМ ВЯДУЦЬ ГАНЕБНЕЙШУЮ ХЛУСЬНЮ СУПРОЦЬ ДЫКТАТАРЫ ПРОЛЕТАРЫЯТУ — СССР. З гэтай брахні асабліва вызначаюцца галасы нямецкага, польскага, румынскага буржуазнага друку.

Францускія і белагвардзейскія газэты, якія выдаюцца ў Парыжы, крычаць:

— ПРАПАЎ ГЕНЭРАЛ КУЦЕПАЎ!.. РУКА МАСКВЫ!!. АГЭНТЫ ЧЭКА!!! РАТУЙЦЕ БАЦЬКАЎШЧЫНУ! ПРЭЧ КРАІНУ БАЛЬШАВІКОЎ!!!

За панамі пацягнуліся і служкі. Вусаты румынскі генэрал Драга голасна заяўляе:

— НЕБЯСЬПЕКА НАДЫХОДЗІЦЬ З ТАГО БОКУ ДНЯСТРА! РАТУЙЦЕ!!!

Ізноў выцягнуты старымі генэраламі вайсковыя мундзіры, тэрмінова рыхтуюцца „праваслаўныя“ і „прававерныя“, католікі і протэстанты і іншыя да „КРЫЖОВАГА ПАХОДУ“ СУПРОЦЬ СССР.

Чаму-ж так шумна на захадзе? Што так занепакоіла і раззлавала лягер імпэрыялістых? Што іх так раззлавала?..

Апошнія месяцы адзначыліся буйнейшымі рэволюцыйнымі падзеямі. Масавыя баі ў Нямеччыне, якія ВЫЛІЛІСЯ Ў КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ з паліцыяй у Гамбурзе, Бэрліне і іншых гарадох, рух беспрацоўных ва ўсіх капіталістычных краінах, шырокая хваля забастовак ва ўсіх краінах, ахопленых сусьветным эканомічным крызісам, —усё гэта гаворыць аб новым рэволюцыйным уздыме працоўных мас, які з кожным днём усё шпарчэй і шпарчэй разгортваецца. Гэта гаворыць аб тым, што хістаецца памяшканьне сусьветнага капіталізму, супярэчнасьці падточваюць яго з усіх бакоў, што набліжаецца час пагібелі капіталістычнага ладу.

І толькі ў аднэй краіне—краіне, дзе будуецца соцыялізм,—бурна расьце соцыялістычная гаспадарка, адбываецца каранная ломка старых устояў. Колгаснае будаўніцтва ідзе нябачным тэмпам.

Гэтага ня могуць вытрымаць самыя моцныя нэрвы любога з буржуа. Пераможны поступ соцыялізму ў СССР разлагае сусьветны капіталізм, падрывае яго ўстоі. Не, гэтага ня могуць вытрымаць нэрвы капіталістых. Бо-ж многія з іх мелі надзею і спадзяюцца яшчэ на зварот капіталізму ў СССР. Памятаеце, у 1921 годзе, пры правядзеньні нэпу яны з радасьцю жагналіся:

— Слава богу! Дачакаліся...

Памятаеце з якім захапленьнем яны насіліся вакол пляцформы правых опортуністых, якія меркавалі прыйсьці да соцыялізму разам з кулаком! Памятаеце, як вольна лабызаліся яны аб „тэорыі мірнага ўрастаньня кулака ў соцыялізм“!

Зараз гэтыя надзеі рушацца.

Краіна прыступіла да жорсткага выкарчоўваньня карэньняў капіталізму. Гэта разьбівае самыя патаемныя, але ўпартыя надзеі нашых ворагаў па аднаўленьне капіталізму ў СССР.

Гэта і разбудзіла балота ворагаў. Вось чаму самыя ціхія і да таго мірна спаўшыя куткі капіталістычнага сьвету ажывіліся, вось чаму з такім шаленствам і КРЫКАМ ПАЧАЛІ ЯНЫ СВАЮ ГАНЕБНЕЙШУЮ КАМПАНІЮ, НАКІРАВАНУЮ СУПРОЦЬ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

Фронт ворагаў, якія гатовы кінуцца ў любую хвіліну на нас, шырыцца. Гэта даводзяць адбыўшыяся падзеі на КУ чыгунцы, разрыў пад дыктоўку ПАЗШ Мэксыкай дыплёматычных зносін з СССР, паездкі чэха-славацкіх міністраў па Эўропе, блёк краін Малой антанты і г. д.

Фронт пашыраецца, але яму супроцьпастаўлен другі фрон: СУСЬВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТУ І ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ НАШАЙ КРАІНЫ. Шалёнай злосьці нашых ворагаў мы можам сказаць толькі адно:

— ВАЙНЫ МЫ НЯ ХОЧАМ, АЛЕ Ў БОЙ ГАТОВЫ!

НАБЛІЖАЕЦЦА ВЯСЕНЬНЯЯ СЯЎБА

Патрэбна чоткая бальшавіцкая работа, патрэбны ўдарныя тэмпы

„... Мы маем матар'яльную базу для замены буйнай кулацкай вытворчасьці буйнай вытворчасьцю колгасаў, магутнага прасоўваньня наперад па стварэньню соцыялістычнага земляробства... Гэтыя абставіны, якія маюць рашаючае значэньне для ўсяе народнае гаспадаркі СССР, далі партыі поўную падставу перайсьці ў сваей практычнай рабоце ад політыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулацтва да політыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы“

У зьвязку з гэтым падрыхтоўка да вяснавага севу ў гэтым годзе набывае выключнае політычнае значэньне

За 2 дні 200 гаспадарак уступілі ў колгас

У г. Петрыкаве, Мазырскай акругі пытаньню колектывізацыі было шмат удзелена ўвагі як гарсаветам, так і комсамольскімі організацыямі. З вясны ўсё гарадзкое сялянства, якое жыве па акрайнах, будзе цалкам колектывізавана. За два дні комсамольскімі організацыямі праведзены сходы сялян г. Петрыкава, у выніку чаго 200 гаспадароў уступілі ў колгас. Праца ў гэтым напрамку працягваецца. У колгас уступілі ня толькі сяляне, а шмат бяднейшых-саматужнікаў, рабочых і служачых. Гарадзкая сельская ячэйка абвясьціла сябе ударнай па дапамозе райкому партыі і гарсавету ў справе колектывізацыі.

Воцат.

ПАД ЗВАНЬНЕМ КУЛАКА



Кулакі меоцамі распрадаюць сва'о маемасьць, каб прабрацца ў колгасы

Раён вялікіх перамог

Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта

Калгасны рух, якім ахоплены далёкія куткі беларускай вёскі на Мазыршчыне ў Петрыкаўскім раёне, дае апошні бой кулацтву.

Кулак, бачачы нямінучую сваю пагібель, спрабуе ўсялякімі мэтадамі весьці барацьбу з непераможным рухам колгаснага будаўніцтва. Ня так даўно ў Камаровіцкім с-с., як толькі пачалася падрыхтоўка да організацыі колгасу, 10 кулакоў, раней займаўшыхся бандытызмам і вызваленых у 1927 г. з папраўчага дому па амністыі, зараз-жа распрадалі сваю маемасьць. Кулак вёскі Шастаковічы—Марціновіч Рыгор спаліў гумно бедняку Марціновічу, які першы ўзьняў пытаньне аб організацыі ў вёсцы Шастаковічах колгасу. Кулакі вёскі Навасёлкі, Белкаўскага с-с. Гумірка, Шут Васіль і інш. у студзені месяцы г. г. організавалі нелегальны сход пасьля чаго павялі актыўную адкрытую агітацыю супроць мерапрыемстваў савецкае ўлады, кажучы, што „у 1930 г. будзе абавязкова вайна, прыйдзе да ўлады цар Ірад, „жыды“ і комуністы будуць уладаць усёй маемасьцю, з 3-х старых асоб будуць рабіць адну маладую“. У гэтай адкрытай барацьбе кулацтва атрымала бой, атрымала адпор беднаты і серадняцтва. Пасьля гэтага кулак перашоў ад лабавой атакі да больш „тонкіх“ мэтадаў барацьбы, так, напрыклад, на сходзе па колектывізацыі ў Асавецкім с-с. кулакі на сходах выступалі за колектывізацыю, а перад сходам настройвалі адсталую частку беднякоў, якія пад кулацкім уплывам выступалі супроць колгасаў.

Дзякуючы добрай падрыхтаванасьці беднаты, такія зьявішчы тут-жа выкрываліся самой беднатой і кулак сумесна з падкупленым ім падкулачнікам разьбіваліся на галаву. У процэсе практычнай працы высьветлілася, што ў некаторых мясцох, па недагляду прадстаўнікоў з раёну, у кіраўніцтва колгасаў пападалі падкулачнікі, вакол якіх групавалася радня—заможнікі, але зараз-жа гэтыя пралазы хутка выкрываліся. Так было ў колгасе „Новае жыцьцё“, аб гэтым яскрава сьведчыць ліст аднаго бедняка-колгасьніка ў раённы камітэт партыі. Ліст прыводзім бяз зьмен“:

„Тав. КПБ. прашу зьвярнуць асаблівую ўвагу на наш колгас, бо ў нас не надзейны кіраўнік, ён абзавёўся радньёй і любімчыкамі заможнікамі, гэта служыць тормазам нашай гаспадаркі“.

Гэта піша бядняк, які шчыра імкнецца наладзіць жыцьцё ў колгасе, а такіх у раёне мы маем дзесяткі і сотні. Не пазбаўлены колгасы Петракоўшчыны і ад пралязьньня самых сапраўдных кулакоў, так, напрыклад, у кастрычніку месяцы 1929 г. у вёсцы Бабрыцках організаваўся колгас, куды пралезьлі 3 кулакі; у Белкаўскі колгас пралез 1 кулак, гэта было і ў цэлым шэрагу іншых колгасаў. Толькі зараз, пры садзейнічаньні бядняцка-серадняцкіх слаёў вёскі, гэтыя пралазы з калгасаў выкінуты. Наўнасьць такога становішча высоўвае перад Петрыкоўскай раённай парторганізацыяй і органамі ўлады неабходнасьць прыняцьця неадкладных мер па правядзеньню чысткі колгасаў зараз-жа. Меліся таксама яўна антысавецкія паводзіны паасобных настаўнікаў, якія выконвалі ролю кулацкіх падпявак, на чым варта затрымацца. Рабочая брыгада па правядзеньню сходу аб колектывізацыі зьявілася да настаўніка Жаховіцкай школы Гусака з просьбай адчыніць памяшканьне школы для сходу. Гусак заявіў: „калі вы хочаце праводзіць сход аб колектывізацыі, то зможаце знайсьці сабе памяшканьне, а школы я ня дам“. Каб ня было далейшых развагаваньняў, Гусак павешаў замкі на дзьверы, а сам недзе схаваўся. Настаўнік перадрэйскай школы Сазонаў, бацька якога плаціць 324 руб. падатку, мае цагельны завод, гэты самы „настаўнік“ Сазонаў на сходах выступае за колектывізацыю, а як толькі скончыцца сход, Сазона заклікае да сябе менш сьвядомую частку сялян, беднякоў і серадзнякоў і тлумачыць ім: „ня ідзеце ў колгас, там вы ўсе падохнеце з голаду“. Гэтыя асобныя кулацкія падпявалы былі своечасова выкрыты, але-ж да гэтага часу саюз працаўнікоў асьветы не асудзіў такіх паводзін, не завострыў увагу ўсёй асьветніцкай масы на праявах варожага элемэнту з профсаюзным білетам у кішэні, не мобілізаваў грамадзкае думкі.

НА ГРУНЦЕ СУЦЭЛЬНАЙ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ЛІКВІДУЮЦЬ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСУ.

Ня гледзячы на досыць актыўную барацьбу кулакоў і іх падпявал у час правядзеньня работы па суцэльнай колектывізацыі раёну, дырэктыва партыі выканана з посьпехам. Прыводзімыя ніжэй матар'ялы яскрава аб гэтым сьведчаць. Раён суцэльна колектывізуецца. Вось лічбы: на 1-е студзеня 1929 г. па раёну мелася 4 колгасы, на 1-е студзеня г. г. налічвалася—13-14 колгасаў, якія аб'ядналі 731 гаспадарку, а за час працы па колектывізацыі ў гэтым годзе па 10-е лютага, па раёну колектывізавана 85 проц. усёй зямельнай плошчы, утворана 40 буйных колгасаў, з якіх вылучана 4 кусты. Гэтыя колгасы абхопліваюць 5977 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Гэтыя лічбы ня сталыя, бо кожны дзень, кожная гадзіна дае новы эфэкт, новы посьпех у справе заваёў соцыялістычнага сэктару.

На грунце суцэльнай колектывізацыі ў раёне праводзіцца ліквідацыя кулацтва, як клясы. З маючыхся 134 кулацкіх гаспадарак на 10-е лютага раскулачана 97 кулакоў, маемасьць якіх тут-жа перададзена ў організаваныя колгасы.

Патрэбна адзначыць асабліва актыўную ролю беднаты ў правядзеньні мерапрыемстваў па раскулачваньню. Справа раскулачваньня пачата, патрэбна толькі гэтае раскулачваньне не праводзіць, як голае раскулачваньне (выпадкі чаго маюцца), а праводзіць, як „абагульваньне кулацкіх сродкаў на базе суцэльнай колектывізацыі цэлых раёнаў і акруг і непрыняцьця кулакоў у колгасы“.

ЯК ЛЮДЗІ, ТАК І МЫ

Петрыкаўская раённая організацыя КСМ налічвае каля 500 вясковых комсамольцаў, з якіх да 1930 г. у колгасах ня было ніводнага. Зараз, у сувязі з суцэльнай колектывізацыяй р-ну, комсамольцы таксама ўступілі ў колгасы, але-ж да гэтага часу комсамольская організацыя накіроўвала ўсю сваю ўвагу на ўздым індывідуальных гаспадарак, ня гледзячы на тое, што Райкомам партыі на працягу ўсяго 1929 г. вялася шырокая падрыхтоўчая праца па колектывізацыі, комсамольцы-ж у гэты час разважалі так: „што будуць рабіць усе людзі, тое і мы, калі ўступяць у колгасы ўсе, дык мы таксама не застанемся па-за колгасамі“, а таму не зьяўляецца дзіўным, што вясковыя ячэйкі не занялі перадавой лініі ў справе разгортваньня колгаснага будаўніцтва ў р-не. На адным з сходаў меў месца такі выпадак, калі ў колгас запісалася 90 сялян і вось комсамолец стоячы ззаду, як кажуць у памельніку, крычаў: „Ну дык запішэце мяне 91-м (Беларускі с.-с.). Усё гэтае сьведчыць, што пытаньне суцэльнай колектывізацыі па комсамольскіх ячэйках прапрацована недастаткова, што комсамольская організацыя Петрыкаўскага р-ну не павярнулася тварам да колгаснага будаўніцтва. У практычнай працы па колектывізацыі ўдзельнічаюць толькі члены Бюро райкому комсамолу і асобныя комсамольцы, уся комсамолія, як мае быць не мобілізавана на справу суцэльнай колектывізацыі.

Мікола Віленчык.

Мы гатовы

У комуне „Чырвоны Штандар“ Касьцюковіцкага раёну, Магілеўскай акругі рыхтуюцца да веснавой пасеўнай кампаніі. Яшчэ на 1 студзеня г. г. усё насеньне сыпалі ў агульны сьвіран. Закупілі трыер і вядзецца ачыстка насеньня. Комсамольцы прынялі актыўны ўдзел у абагульненьні насеньня. На 5 лютага абагулена 1 50 пудоў жыта, 1151 пуд грэчкі, 100 пудоў ільнянога насеньня, 20 пудоў азімай пшаніцы, 80 пудоў проса і 150 пудоў аўсу. Скончыць ачыстку мяркуецца прыблізна да 1-га сакавіка.

Кавалёў.

Спынеце разбазарваньне насеньня

У Пакуцкім сельсавеце, Дрыбінскага раёну, Аршанскай акругі ў кастрычніку 1929 году організавана комуна „Шлях Селяніна“. Пасьля організацыі сябры комуны пачалі абагульваць сваю маёмасьць. Кіраваць справай абагуленьня даручана праўленьню комуны. На сёньнешні дзень абагулена жывёла і інвэнтар, а ў адносінах абагуленьня насеньня справа абстаіць ДРЭННА.

Некаторыя сябры комуны разбазарваюць сваё насеньне. Праўленьне комуны ня толькі ня прымае ніякіх мер, а нават дапамагае гэтаму. У студзені гэтага году сябрамі гэтае комуны было выяўлена, што Краўцоў Язэп, сябра комуны (ён-жа комсамолец), сумесна з сваім бацькам прадаў 35 пудоў аўсу, 30 пудоў ячменю і каля 20 пудоў пшаніцы.

Краўцоў яра выступае супроць ачысткі насеньня, супроць рамонту інвэнтару і гэта робіцца дзякуючы таму, што яго брат, які ў праўленьні комуны, абараняе яго.

Зараз у комуне абагулена і ачышчана ўсяго каля 1 трэцяй часткі насеньня патрэбнага для засеву. Аб здабыцьці насеньня і аб рамонце патрэбнага інвэнтару ніхто і ня думае. Кіраўнікі па свойму працягваюць сваю працу.

ПЯТРУСЬ.

***

У Гатовінскім сельсавеце Заслаўскага раёну да вясновай пасеў-кампаніі амаль што зусім ня рыхтуюцца. На 1-II—30 году па ўсім сельсавеце ачышчана насеньня ўсяго 743,5 цэнтнэра. Былі выпадкі, калі прысылалі машыну з дзіравымі сітамі.

Сяляне адмаўляліся ачышчаць насеньне на такіх машынах. Такіх машын ня трэба пасылаць на вёскі, бо яны не даюць карысьці. Камсамольская ячэйка саўгасу нічога ўдзелу ня прымае ў падрыхтоўцы да вясновай сяўбы.

ПЯТУХОЎ.

Лёзунгі да XII гадавіны Чырвонай арміі

1. Імпэрыялістыя шалёна рыхтуюць вайну супроць СССР. Антысавецкае цкаваньне ўзмацняецца. Чырвоная армія, будзь на варце!
2. Пролетарыі ўсяго сьвету, організуйцеся ў адзіны фронт рэволюцыйнай барацьбы супроць імпэрыялізму, за Рэспубліку Саветаў!
3. Прывітаньне Чырвонай арміі—узброенаму атраду сусьветнай рэволюцыі, слаўнаму, баявому абаронцу Савецкага Саюзу!
4. УсеКП(б) — правадыр і організатар Чырвонай арміі. Шчыльней згуртуем баявыя рады арміі вакол УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК!
5. За індустрыялізацыю—аснову будаўніцтва соцыялізму і абароны Савецкага Саюзу!
6. Заменім кулацкую гаспадарку саўгасамі і колгасамі. Ліквідуем кулацтва — клясу дармаедаў, крывапіўцаў, эксплёататараў!
7. Пролетар, памятай, што, выконваючы і перавышаючы промфінплян, ты ўмацоўваеш абарону Савецкага Саюзу!
8. Чырвонаштандарнай Далёка-Ўсходняй арміі, яе байцам камандзірам і політработнікам нашае палкае прывітаньне. Слава гэроям Далёка-Ўсходняй, што загінулі ў баёх за соцыялізм.
9. Паветранаму флёту, абаронцы соцыялістычнага будаўніцтва, пролетарскае прывітаньне. Сотні новых сталёвых птушак на папаўненьне яго баявой магутнасьці!
10. Прывітаньне бяззьменнаму і пільнаму вартаўніку морскіх межаў Савецкага Саюзу—Чырвонаму вайсковаму флёту. Прывітаньне Далёка-Ўсходняй флётыліі.
11. Дзёш танк, самалёт! Даёш матор! Даеш магутную тэхніку Чырвонай арміі!
12. Камандзір і чырвонаармеец, аўладайце на справе тэхнічнымі сродкамі барацьбы!
13. Камандзіры, політработнікі, чырвонаармейцы! Аўладайце вышэйшымі формамі сучаснага бою для абароны Савецкага Саюзу!
14. Комсамолец! У Чырвонай арміі будзь першым у вучобе і дысцыпліне, першым у аўладаньні тэхнікай, першым на баявой лініі! Няхай жыве Ленінскі комсамол!
15. Піонэр, вучыся у Чырвонай арміі змагацца за справу рабочае клясы!
16. Няхай жыве чырвоная конніца—слаўны баявы атрад Чырвонай арміі!
17. У дзень X гадавіны 1-й коннай арміі—старым байцом, гэроям і кіраўніком яе нашае палкае прывітаньне!
18. Конь яшчэ доўга будзе верным памочнікам матора. Колгасы і саўгасы, дайце баявога каня Чырвонай арміі!
19. Рабочыя і сяляне, работніцы і сялянкі, уступайце ў Асоавіяхім узмацняйце абарону краіны!
20. Профсаюзы, лепш умацоўвайце справу вайсковай падрыхтоўкі пролетарыяту!
21. Прывітаньне перадавому атраду соцыялістычнага спаборніцтва ў РСЧА — ударнікам-чырвонаармейцам!
22. Рабочы, калгасьнік, чырвонаармеец, будзьце гатовы!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ УсеКП(б).



У многіх ячэйках пытаньне аб насенных фондах закінута на задні плян.

З фронту падрыхтоўкі да вясновай сяўбы

На агульным сходзе гарсавецкай ячэйкі КСМ г. Сенна (Віцебшчына) па правядзеньню пасеўкампаніі ячэйка абвясьціла сябе ўдарнай.

Ячэйка па дабраахвотнасьці падзялілася на тры часткі. Кожная ячэйка ўзяла сабе сельсавет і зараз-жа пачала праводзіць працу ў вёсках. На соцыялістычнае спаборніцтва па лепшаму правядзеньню пасеўкампаніі гарсавецкая ячэйка выклікала працзямлесаўскую ячэйку.

ЖЫЦЕЛЬЗЭЙФ З.

***

Пасеўная кампанія набліжаецца. Часу засталося зусім мала. Дароскі сельсавет Стара-Дароскага раёну разьлічвае на тое, што ён яшчэ падрыхтуецца... У выніку гэтых марнаваньняў праца па правядзеньню веснавой пасеўкампаніі амаль не распачата. Плян ачысткі насеньня выкананы ўсяго на 6%.

ШВАНКОЎ.

***

Значныя посьпехі ў правядзеньні вясновай пасеўкампаніі мае Бялыніцкі раён.

Профячэйка і ячэйка школы сялянскай моладзі ўзялі шэфства над ачысткай насеньня. Ужо ачысьцілі 2100 пудоў насеньня. Праца праводзілася па чарзе. Цяпер гэтыя ячэйкі ўзялі шэфства над Нешкаўскім і Ланькаўскім сельсаветамі. Зьбіраецца попел у вызначаныя дні для колектывізацыі. У фонд колектывізацыі сабрана 1235 руб. грашыма і аблігацыямі.

НІЗАЎЦОЎ.

***

Колгас „Зорка соцыялізму“ прыступіў да ачысткі насеньня. Ачышчана 55% усяго аўсу. Прыступлена да ачысткі ячменю і пшаніцы. Сябры колгасу добра адносяцца да праводзімай працы, а таксама здаюць поўнасьцю сваё насеньне.

КОЛГАСЬНІК.

***

Жальвінецкі камітэт сялянскай узаемадапамогі (Глускі раён) да вясновай сяўбы мае 450 пудоў насеньня аўсу, ячменю і грэчкі, якое будзе раздадзена ў першую чаргу беднаце.

ЦАРЫК.

Ні кроку назад ад прамфінпляну!

Не хавайцеся за барыкадамі абяцаньняў

Як чэрці змагайцеся за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну

Ударная брыгада Менбудтрэсту ганебна парушыла соцыялістычны дагавор

Рашуча выступіць у бой за выкананьне прамфінпляну

Прайшло ўжо больш месяцу, як ЦК ЛКСМБ паставіў пытаньне перад усімі комсамольскімі організацыямі, што адказнасьць за невыкананьне промфінпляну кожнага прадпрыемства нясуць у роўнай меры як гаспадарчыя. профсаюзныя організацыі, так і комсамольскія ячэйкі. ЦК у сваёй пастанове за вынікі выкананьня промфінпляну за першы квартал бягучага гаспадарчага году ні ў якім разе ня зьнімае віны і з комсамольскай організацыі.

Ня гледзячы на тое, што ў гэтым годзе мы ў адпаведнасьці з мінулым годам маем некаторыя паляпшэньні ў справе зьніжэньня сабекошту, росту вытворчасьці працы, росту валавай продукцыі але разам з гэтым мы маем неда выкананьне намечаных кантрольнымі лічбамі колькасных і якасных паказчыкаў. Сабекошт зьніжан на 4,5 проц. замест 11,7 проц., вытворчасьць працы ўзьнята на 26,9 проц. замест 37,6 проц., валавай продукцыі выпушчана на 20 проц., менш чым меркавалася, а ўсё гэта складае каля 4 мільёнаў рублёў. За гэтыя грошы мы змаглі б выкладна пабудаваць такі другі комбінат па сельска-гаспадарчаму машыннаму будаўніцтву, які канчваем будаваць у гэтым годзе ў Гомелі.

ГАЛОЎНАЯ ПРЫЧЫНА НЕВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЯК ГЭТА АДЗНАЧЫЎ ЦК. У НЕПАВАРОТЛІВАСЬЦІ, НЯДБАЙНАСЬЦІ, БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦІ ПРОФСАЮЗНЫХ, ГАСПАДАРЧЫХ КОМСАМОЛЬСКІХ ОРГАНІЗАЦЫЙ. НЯЎМЕНЬНЕ МОБІЛІЗАВАЦЬ ШЫРОКІЯ КОЛЫ РАБОЧЫХ НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ВЫЗНАЧАНЫХ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ, НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДКІ У ЧАТЫРЫ ГАДЫ.

Накіруем агонь на тэорыю „об'ектыўных" прычын

Трэба рашуча адхіліць тыя правa опортуністычныя разважаньні сярод асобных гаспадарнікаў комсамольскіх, профэсыянальных працаўнікоў наконт нейкіх-та об'ектыўных прычын, зрабіўшых уплыў на пасьпяховае выкананьне прамфінпляну а першы квартал.

Не об'ектыўныя прычыны тут віною, а ня ўменьне працаваць, ня ўменьне мобілізаваць на належнаму руслу актыўнасьць рабочых мас.

Яшчэ да сёняшняга дню амаль што ні на адным прадпрыемстве не даведзены прамфінпляны да кожнага цэху (не гаворачы ўжо аб кожнай брыгадзе і кожным рабочым), што галоўным чынам забясьпечыла-б выкананьне прамфінпляну. Ня робіцца інформацый за якім цэхам і якой брыгадай недавыкананьне, а займаюцца агульным разважаньнем на агульных сходах аб неабходнасьці падняцьці працоунаі дысцыпліны. вытворчасьці працы (завод „Пролетары" Гомель).

У сьнежні месяцы мы мелі 1,26 проц. звыштэрміновых работ, што абышлося прамысловасьці 20-30 тысяч рублёў. Таксама за прастоі выплачана звыш 30 тысяч рублёў.

На шэрагу галін прамысловасьці (будаўнічая, хэмічная, запалкавая) растуць прагулы, а таксама і спазьненьні. Нават да сёнешняга дню на заводзе „Пролетары" і інш. прадпрыемствах існуюць яшчэ традыцыйныя 10-хвілінныя спазьненьні. Пасьля гудка 10 хвілін табель адкрыты. Перад абедам за 10 хвілін да гудка, а таксама і перад скончэньнем работы табель раней адкрываецца. Гэта ўсё гаворыць за тое, што НЕ ОБ'ЕКТЫЎНЫЯ ПРЫЧЫНЫ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЮ ПРАМФІНПЛЯНУ, А НЯЎМЕНЬНЕ КІРАВАЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАМ, А ТАКСАМА НЕАДПАВЕДНАСЬЦІ НЕКАТОРЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ. СТАНАВІЦЦА НА ШЛЯХ АЦЭНКІ, ШТО ОБ'ЕКТЫЎНЫЯ ПРЫЧЫНЫ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН, —ПА СУТНАСЬЦІ ПАТАКАЦЬ ПРАВЫМ ОПОРТУНІСТЫМ.

Пералом не наступіў

Прайшло ўжо паўтара месяца другога кварталу, а пералому яшчэ ў ячэйках ЛКСМБ у справе выкананьня прамфінпляну амаль няма.

Комсамольскія ячэйкі не падышлі шчыльна да вытворчасьці, не падпарадкавалі працы ячэйкі да задачы выкананьня прамфінпляну. Яшчэ можна многа знайсьці такіх ячэек, дзе ня ўсе комсамольцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі. Так, напрыклад. Тыдзень таму назад з 10 прадпрыемстваў Гомельшчыны з агульнага ліку 1124 комсамольцаў у двох ударных брыгадах знаходзілася толькі 698 чал.

Не на ўсіх прадпрыемствах праведзен вытворчы дзень.

Комсамольскія ячэйкі ў большасьці плятуцца ў хвасьце замест таго, каб сапраўды пайсьці ў бой за выкананьне промфінпляну. Кожная комсамольская ячэйка павінна памятаць, што ня будзе апраўдваць назву ячэйкі ленінскага комсамолу, калі яна ня зможа дабіцца таго, каб прадпрыемства выканала з перавышэньнем прамфінплян.

Той комсамолец, які не змагаецца за выкананьне прамфінпляну, які не знаходзіцца і ня хоча ўступіць на ўдарныя брыгады, НЯ МОЖА БЫЦЬ КОМСАМОЛЬЦАМ. Тая ўдарная брыгада ня мае права лічыць сябе ударнай, калі яна ня выконвае вытворчых заданьняў.

Комсамол павінен пайсьці ўдарным тэмпам у паход за 4 мільёны рублёў да канца другога кварталу.

РАМІЗЭВІЧ.

Ударны прарыў

Гэта было ў жніўні 1929 году. Група маладых статяроў Цэнтральнай Базы Мен. Буду (б. Гандльбудт-у) стварыла ўдарную брыгаду з 7 чалавек. Спачатку брыгада ўзялася ўпарта за працу, ня было ні хвілінкі прастою, давалі добрую продукцыю і зьнізілі расцэнкі на 5 проц.

Студзень

Ленінскі заклік... Маса заварушылася. База зрабілася ўдарнай. Зьнізілі расцэнкі, выпрацавалі ўмовы. Ініцыятыва мас перарасла ініцыятыву кіраўнікоў. Рабочы ўдарнік **Галоўчанка** унёс 100 рублёў 3-й пазыкі індустрыялізацыі ў фонд індустрыялізацыі, рабочы **Шапіра** ўнёс 150 рублёў. Маса клакоча, яна ідзе разам з партыяй, і ўступае ў шэрагі партыі. Уступілі: **Абельшчук**, каваль, на вытворчасьці 37 год, **Губіч**, на вытворчасьці 35 год, **Рабін віч**—35 год, **Карот**—32, **Вашкевіч**—26 і шэраг іншых. **Маса** жыве і працуе. Перабудоўваюцца формы працы, база лічыцца ўдарнай і з гонарам нясе гэта званьне.

...І раптам...

Шэпт працоў па базе. „Лёгкая Кавалерыя" прышла правэрыць якасьць продукцыі майстэрняў. Яны абглядалі продукцыю, якая была здадзена на пабудову 56 кватэрнага дому, 1-ай вытворчай маладзёжнай ударнай брыгадай.

«Лёгкая Кавалерыя» выявіла, што зробленыя рамы былі складзены зусім дрэнна, што якасьць іх ніжэй усякай крытыкі. Рамы аказваліся недапасаванымі, нядбайна склееныя і зусім дрэнна пачышчаны. Яны былі зроблены з ударнай сьпешнасьцю з мэтай выганкі грошай, а ня з мэтай падняцьця вытворчасьці. У гэтай шалёнай гонцы маладыя рабочыя зараблялі па **160** рублёў у месяц, замест 110—120 рублёў пры звычайнай рабоце. Рамы зроблены дрэнна, старшы майстар тав. **Макараў** некалькі раз звяртаў увагу ўдарнікаў на дрэнную якасьць, але яны гэтага пад увагу ня бралі. Вытворчая нарада гэтым пытаньнем не займалася. З месяцы таму назад гаварылі аб якасьці продукцыі аб дрэннай працы, але з таго часу гэтым пытаньнем больш не займаліся. Толькі «лёгкая кавалерыя» прымусіла шмат каго прыгадумацца. Гэта ўсё адбывалася у той час, калі пытаньне якасьці продукцыі пастаўлена рубам, калі выкананьне промфінпляну ставіцца як баявая задача. Гэты прарыў паказвае на колькі некаторыя ўдарнікі ў пагоне за колькасьцю продукцыі губяць свой клясавы твар перадавікоў ударнікаў і перараджаюцца ў рвачоў-шкоднікаў. Наколькі шкодна пустая урачыстасьць без штодзённага кіраўніцтва.

Гэты вурок павінны ўлічыць усе ўдарныя брыгады. Застаецца незразумелым, як нікуды нявартыя рамы былі выпушчаны з базы? Хто іх праверыў, хто будзе адказваць за дрэнную працу і калі будуць зроблены гэтыя вынікі.

Ударнікі заслужылі сабе месца на чорнай дошцы, яны налажылі чорную пляму на ўдарную базу, яны павінны гэту пляму зьняць, але ня словамі, а справай.

Лео.

БЫЦЬ ПЕРШЫМІ НА БАЯВЫХ ВУЧАСТКАХ

Бліжэй да вытворчасьці.--Даволі нячулых адносін да „Л.К.".--Умець знаходзіць галоўнае ў штодзённай рабоце

З спрэчак па дакладу ЦКК КП(б)Б тав. Лазоўскага і ЦК ЛКСМБ тав. Палякова

Тов. Геллер

Віцебск.

Барацьба за кадры—асноўнае ў рабоце груп „ЛК" навучальных устаноў

— Я хачу застанавіцца на пытаньнях работы груп „лёгкай кавалерыі" ў навучальных установах.

Мне даручана Віцебскай раённай конфэрэнцыяй „ЛК" на ўсебеларускім зьлёце завастрыць пытаньне аб тым, што некаторыя райкомы і організацыі легка адносяцца да справы самачысткі навучальных устаноў. Выражаецца гэта ў тым, што на працягу шэрагу месяцаў яны не адказваюць на запытаньні груп „лёгкай кавалерыі" і гэта дае магчымасьць пралазіць у нашы навучальныя ўстановы соцыяльна чужому элемэнту.

Тав. Хамякоў

Полацак.

Агонь накіраваць сюды

— Агонь „лёгкіх кавалерыстых" трэба накіроўваць на барацьбу з скажэньнямі клясавай лініі ў рабоце устаноў і організацый. Нядаўна па абсьледваньню судовага апарату я выкрыў такі факт, што да пытаньня абароны батрацтва судовыя органы падыходзілі з клясавай блізарукасьцю. Амаль 50 проц працоўных спраў па конфлі тах батракоў з кулакамі спынена па прычыне рознай бакоў. Бачыце, суд мірыць батрака з кулаком. Гэта найагіднейшы факт. Замест таго, каб асудзіць кулака, суд часам мірыць.

Возьмем Полацкую сэкцыю працы, якая павінна абараняць інтарэсы працоўных, а там наглядаюцца парушэньні працоўнага законадаўства. Напрыклад, ад кулака Акулы, які мае дзесятак кароў, 5—6 коняй, млыны, спаганяюцца штрафу 5 рублёў. І разам з гэтым, разглядаючы справу працоўных, суд таксама накладае штрафу 5 рублёў. Гэта завецца клясавым падыходам. Вось „лёгкая кавалерыя" павінна на такія факты кідаць свае пікі. Зьлёт павінен зьвярнуць увагу „кавалерыі" іменна на гэтыя вучасткі барацьбы



Дэлегаты зьлёту—піонэр і стары рабочы—„лёгкія кавалерыстыя"

Тав. Шэндарэй

Гомель, ф-ка Клары Цэткін

Патрэбна мобілізаваць масы

Атрад „Лёгкай кавалерыі" на фабрыцы Клары Цэткін з першых дзён сваёй працы ўзяў правільны напрамак. На працягу сваёй працы ім выкрыта шэраг спраў, на якіх завастралася ўвага грамадзкасьці. Праведзена некалькі масавых налётаў на прадпрыемства па ўсіх цэхах. Тут выяўлена шэраг недахопаў, зажым самакрытыкі і г. д. „Кавалерыстыя" аб гэтым сыгналізавалі ў прэсе, а таксама ставілі пытаньне на фабкоме.

Каб падняць навокал гэтых спраў масы, быў наладжан паказальны суд, рабочыя выступілі ў якасьці сьведак, што мела вялікае значэньне. „Кавалерыстымі" расьследавана 240 спраў па сваёй ініцыятыве і толькі 95—па даручэньні РСІ, 130 спраў-скаргі рабочых.

У час месячніку зьберажэньняў кавалерыстымі былі наладжаны налёты на ашчадкасы. Да пачатку гэтага месяцу таксама было праведзена 9 налётаў на ашчадкасы.

Трэба сказаць, што большасьць спраў, пачатых кавалерыстымі, ужо даведзена да канца. Недахопам у нашай рабоце зьяўляецца і тое, што наш актыў, які павінен ісьці ў першых шэрагах атраду, не займае такога віднага становішча.

Тав. Фурман

Менск, завод «Бальшавік»

Увага рабочым прапановам

Кепска тое, што мы часта ня ведаем, што робіцца з вынікамі па нашых абсьледваньнях. Нядаўна атрадам „лёгкай кавалерыі" быў зроблен налёт на агульна-завадскія камісіі, у выніку якога выяўлена, што пастанова Саўнаркому і ЦКК РСІ аб прэміраваньні тых рабочых, якія ўносяць добрыя прапановы, ня выконваюцца. Шэраг рабочых унясло прапановы, але іх не прэміравалі. „Кавалерыстыя" выкрылі прычыны чаму не выконваюцца прапановы рабочых і аказалася, што яны папалі ў папкі і ляжаць бяз руху.

Чаму цэх прастаяў 6 зьмен

(Ліст з бабруйскага комбінату)

У бабруйскім дрэваапрацовачным комбінаце справа з выкананьнем прамфінпляну абстаіць дрэнна, асабліва ў фанэрным цэху. 8-га лютага ў гэтым цэху ўзарваўся вадаспускны кацёл, ад сушыльных прэсаў. Цэх прастаяў каля 6 рабочых зьмен. Страты абыходзяцца ў 2000 рублёў.

У беладзераўным цэху патрабавалася ўстанавіць кран штэйнавую пляцоўку для электрычных матораў. Аказалася, перашкаджаюць сьцены а таксама не хапае месца. Патрабавалася таксама ўстанавіць параправодныя батарэі дзя чаго неабходна было падняць вокны на 70 сант. вышэй бо чарцяжы несупадалі з разьмерамі будынку. Пачынаюць праводзіць тэхнічныя нарады, астаноўкі работ; ударныя брыгады пасылаюцца на ўсялякія некваліфікаваныя работы.

У Ленінскія дні цэх прастаяў 4 гадзіны. З працы было зьнята 5 рабочых у тым ліку некалькі комсамольцаў. Некаторыя рабочыя сьведчаць, што галоўным вінаваццаю ў гэтым быў загадчык па дастаўцы драўніны к шэйль-машынам т. Юраўскі.

Бываюць выпадкі масавых прагулаў па віне самых рабочых, а таксама і адміністрацыі. Таксама бываюць прастоі з-за несваечасовай дастаўкі матар'ялаў. Шмат рабочых на работу зьяўляюцца ў п'яным выглядзе. Рабочыя і адміністрацыйны пэрсонал часта не знаёмы з асноўнымі элемэнтамі сваёй працы ў некаторых вытворчых галінах. Прыкладам загадчыца фанэрным цэхам тав. Розіна недастаткова знаёма з кіраваньнем цэхам, дзеля ня ўменьне падбіраць патрэбных рабочых і г. д.

Лёгкі кавалерыст.

Бесьперапынны перабой у дастаўцы сыравіны

Гомельская майстэрня працколентыву па вырабу кошыкаў даўно перашла ўжо на бесьперапынны рабочы тыдзень, але да гэтага часу яшчэ маецца шмат перабояў у дастаўцы розных тэхнічных матар'ялаў і сыравіны.

Рабочыя вельмі часта сядзяць без работы па некалькі гадзін. Здаецца, што пара ўжо пакончыць з цяганінай і спыніць галавацяпскія адносіны да работы.

Ц.

Патрэбен рашучы пералом

Фізкультуру неабходна падпарадкаваць задачам соцыялістычнага будаўніцтва, ператварыць яе ў сапраўдны фактар грамадзка-палітычнага выхаваньня мас

Цэнтральны камітэт партыі прызнаў сучаснае становішча фізкультуры нездавальняючым і ў сваёй пастанове даў поўныя і яскравыя дырэктывы ў галіне далейшага разгортваньня фізкультурнай работы, форм і мэтадаў яе перабудовы ў адпаведнасьці з палітычнымі задачамі сучаснага рэконструкцыйнага пэрыоду соцыялістычнага будаўніцтва.

У якасьці асноўных недахопаў фізкультурнага руху ЦК УсеКП(б) адзначыў слабы ахоп рабочых, работніц і асабліва рабочай моладзі фізкультурай, рэкордсмэнскі ўхіл у фізкультурных гуртках, слабае разгортваньне фізкультуры на вёсцы, ведамсьцьвенны разнабой у фізкультурнай рабоце і прызнаў неабходным: „Зьнішчыць разнабой у фізкультурнай рабоце, увесьці ў яе больш організаванасьці, плянамернасьці, максымальна пашырыць агульны маштаб фізкультурнай работы, забясьпечыць уцягненьне ў фізкультурны рух рабочых мас і узмацніць фізкультурную работу на вёсцы“.

Разам з гэтым Цэнтральны камітэт УсеКП(б) паставіў перад профсаюзамі і комсамолам задачу ўсямернага ўзмацненьня і палепшаньня справы клясавага грамадзка-палітычнага выхаваньня фізкультурнікаў; шырокай падрыхтоўкай новых інструктарскіх кадраў з ліку рабочых і вызначыў у якасьці організацыйнай асновы перабудовы фізкультурнай работы дабраахвотнасьць і выбарнасьць усіх фізкультурных органаў у профсаюзах,—з аднаго боку і ператварэньня саветаў фізкультуры ў кіраўнічыя дзяржаўныя органы—з другога боку. У выкананьне дырэктыў партыі ЎсеЦСПС устанавіў пэўную сыстэму організацыйнай перабудовы фізкультуры ў профсаюзах і парадак ажыцьцяўленьня гэтай новай сыстэмы зараз, пасьля перавыбараў бюро фізкультурных гурткоў і правядзеньня конфэрэнцый па асобных саюзах, склікаецца міжсаюзная ўсебеларуская конфэрэнцыя фізкультурнікаў.

На сёнешні дзень мы маем факты, якія гавораць аб тым, што гурткі фізкультуры ў цэлым шэрагу выпадкаў выступаюць у якасьці актыўных праваднікоў гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў профсаюзаў і комсамолу (культурнае шэфства над колгасамі, ачыстка насеньня, агітацыйныя лыжныя вылазкі ў вёску, утварэньне ўдарных брыгад фізкультурнікаў, збор сродкаў на трактар „Фізкультурнік Беларусі“ і інш.). Напрыклад, створаны ўдарныя брыгады з фізкультурнікаў на панчошнай фабрыцы у Віцебску, у дрэваапрацоўчнікаў і ў мэталістых у Менску, ня кажучы ўжо аб тым, што ва ўдарныя брыгады на вытворчасьці ўваходзіць значная частка фізкультурнікаў.

У Менску фізкультурнікі саюзу гарбароў, дрэваапрацовачнікаў, будаўнікоў правялі шэраг выездаў на лыжах у вёску для популярызацыі колгаснага руху і правядзеньня ачысткі насеньня. Фізкультурнікі менскага гуртка сельска-гаспадарчых рабочых—спэцыялістыя правялі лыжную вылазку ў тры савгасы, дзе організавалі гурткі фізкультуры, дапамаглі сваімі паказаньнямі па гаспадарчых пытаньнях работы савгасаў. Гэткая-ж работа праводзіцца і ў іншых гарадох.

Соцыялістычнае спаборніцтва ўсё шырэй уваходзіць у сыстэму работы фізкультурных гурткоў,—значна ўзрасла актыўнасьць фізкультурнікаў.

Па Менску заключан соцдагавор паміж фізкультурнікамі саюзаў гарбароў і будаўнікоў, дрэваапрацовачнікаў і харчавікоў, швэйнікаў, друкароў. Акрамя таго падпісан дагавор аб соцыялістычным спаборніцтве паміж гурткамі гарбароў і мэталістых Менску – з аднаго боку і Віцебску—з другога. Фізкультурнікі Беларусі заключылі агульны соцдагавор з фізкультурнікамі Заходняй вобласьці.

АЛЕ РАЗАМ З ГЭТЫМ МЫ ЯШЧЭ ДАЛЁКІ АД ТАГО СТАНОВІШЧА, КАЛІ МАГЧЫМА БЫЛО СКАЗАЦЬ, ШТО ФІЗКУЛЬТУРНАЯ РАБОТА ЎЗЬНЯТА НА НАЛЕЖНУЮ ВЫШЫНЮ І НЕ АДСТАЕ АД АГУЛЬНАГА ТЭМПУ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАУНІЦТВА, ЗАДАВАЛЬНЯЕ ТЫМ ПАТРАБАВАНЬНЯМ, якія зараз прад'яўляюцца да фізкультурнага руху.

Усе дасягненьні, якія мы маем на сёнешні дзень, зьяўляюцца толькі пачаткам таго вялікага і рашучага пералому, які павінен быць зроблен у фізкультурным руху на аснове рашэньняў ЦК УсеКП(б).

КОЛЬКАСЬЦЬ АХОПЛЕНЫХ ФІЗКУЛЬТУРАЮ РАБОЧЫХ ЗУСІМ НЕЗАДАВАЛЬНЯЮЧАЯ. З 257 тысяч членаў саюзаў гурткамі фізкультуры АХОПЛЕНА ТОЛЬКІ 20 ТЫСЯЧ (МЕНШ 5 ПРОЦ.) ЯШЧЭ ЗУСІМ СЛАБА РАЗГОРНУТА ФІЗКУЛЬТУРА Ў СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ СЭКТАРЫ ВЁСКІ (З 220 САВГАСАЎ ГУРТКІ МАЮЦЦА ТОЛЬКІ Ў 70).

Склад інструктароў і па колькасьці і па якасьці не адпавядае запатрабаваньням работы. ПАДРЫХТОЎКА НОВЫХ ІНСТРУКТАРСКІХ КАДРАЎ ЯШЧЭ НЕ РАЗГОРНУТА Ў НАЛЕЖНЫМ ТЭМПЕ. ЯШЧЭ НЕ ВА ЎСІХ ГУРТКОХ ФІЗКУЛЬТУРЫ РАЗГОРНУТА ЯК НАЛЕЖЫЦЬ САМАДЗЕЙНАСЬЦЬ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ І САМАКРЫТЫКА, КУЛЬГАЕ КІРАЎНІЦТВА ГУРТКАМІ З БОКУ НІЗАВЫХ САЮЗНЫХ І КОМСАМОЛЬСКІХ ОРГАНІЗАЦЫЙ.

У пэрыод падрыхтоўкі да міжсаюзнай конфэрэнцыі фізкультурнікаў праводзілася шырокая самаправерка фізкультурнай работы саюзаў з выпраўленьнем недахопаў на хаду. МІЖСАЮЗНАЯ КОНФЭРЭНЦЫЯ ПАВІННА БУДЗЕ РАСПРАЦАВАЦЬ ПЛЯН ШЫРОКАГА ОРГАНІЗАВАНАГА І РАШУЧАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ ПА ШЛЯХУ КАРАННОЙ ПЕРАБУДОВЫ ФОРМ І ЗЬМЕСТУ ФІЗКУЛЬТУРНАЙ РАБОТЫ ПРОФСАЮЗАЎ У СУАДПАВЕДНАСЬЦІ З ЗАПАТРАБАВАНЬНЯМІ РЭКОНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫОДУ І ЗАДАЧАМІ ФІЗКУЛЬТУРНАГА РУХУ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧАНЫ ПАРТЫЯЙ.

ФІЗКУЛЬТУРНІК.

АД РЭДАКЦЫІ: ЗЬМЯШЧАЮЧЫ ГЭТЫ АРТЫКУЛ, РЭДАКЦЫЯ ПРОСІЦЬ ЧЫТАЧОЎ ВЫКАЗАЦЦА НА СТАРОНКАХ НАШАЙ ГАЗЭТЫ. АСАБЛІВА ПА ПЫТАНЬНЯХ АЦЭНКІ СУЧАСНАГА СТАНОВІШЧА ФІЗКУЛЬТ-РУХУ, СОЦСПАБОРНІЦТВЕ, ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА МІЖСАЮЗНАЙ УСЕБЕЛАРУСКАЙ КОНФЭРЭНЦЫІ, УДЗЕЛ ФІЗКУЛЬТУРНЫХ ГУРТКОЎ У ВЫКАНАНЬНІ ГАЛОЎНЫХ ГАСПАДАРЧЫХ І ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАДАЧ.

Расклад дакладаў па падрыхтоўцы

да усебеларускага палітбою па нацпытаньню і пяцігодцы

1. 26-II — Задачы палітбоя. — ХАРКОЎ (радыё-цэнтр, 19г. 30-х — 20 гадзін).
2. 4-III—Ленін і нац. пытаньне — ВЫДРА (Дом Комасьветы—19 г. — 20 гадзін).
3. 10-III — Рэволюцыйны рух Заходняй Беларусі — СТАЛЕВІЧ (Дом Комасьветы 19 г—20 г.).
4. 15-III — Нац культурнае будаўніцтва у 5-годцы — ПЛАТУН (Дом Комасьветы 19 г.—20 г.).
5. 20-III — Беларускі нац. дэмократызм праявы расійскага, яўрэйскага і інш. шовінізмаў і барацьба з імі — КАНАКОЦІН (Дом Комасьветы 19 г.—20 г.)
6. 25-III—БССР праз 5 год і задачы комсамолу — СТРАКОЎСКІ (Дом Комасьветы– 19 г.—20 г.).
7. 29-III — ЛКСМБ у гаспадарча-культурным будаўніцтве — ШОЛАМАЎ (Дом Комасьветы 19 г.—20 г.).

Даклады сьценаграфуюцца і здаюцца ў друк. Сэрыяй выданьня АПА ЦК ЛКСМБ „Да усебеларускага палітбою“.

Пасьля дакладу адбудзецца концэрт радыё цэнтру.

Білеты на ўваход на 4-III, 10-III, 20-III распаўсюджваюцца Домам Комасьветы па РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ.

На 15-III, 25-III, 29-III — даклады толькі для комсамольскага актыву.

Білеты распаўсюджвае АК ЛКСМБ па РК ЛКСМБ.

ЦК ЛКСМБ. ДОМ КОМАСЬВЕТЫ РАДЫЁ-ЦЭНТР.

Галавацяпы зрываюць

Карысныя мерапрыемствы па культурнаму абслугоўваньню рабочых

У трохмесячніку, беларускай пролетарскай культуры, беларускі радыё-цэнтр наладжвае цэлы шэраг концэртаў і лекцый у рабочых клюбах на тэму: „Як слухаць і разумець музыку“. Некаторыя організацыі па галавацяпску гэтыя карысныя мерапрыемствы зрываюць. Такі абураючы выпадак адбыўся на гэтых днях у клюбе мэталістых. Бел. радыё-цэнтрам былі дадзены дармовыя концэрты ў клюбе мэталістых (13 і 17-га лютага), але загадчык клюбу тав. Сакалоўскі пачаў распаўсюджваць білеты за 3 гадзіны да концэрту і таму зусім зразумела, што заля клюбу Мэталістых, якая ўмяшчае 800 чалавек была амаль пустая. Концэрт быў сарваны, рабочыя скардзіліся: „У нас на заводзе 1000 чалавек, усе-б з прыемнасьцю пашлі на концэрт, але нас ніхто не паведаміў“. Трэба моцна ўдарыць па конкрэтных насіцелях галавацяпства, ударыць па руках тых, хто зрывае карысныя мерапрыемствы трохмесячніку беларускай і нац. меншасьцяў пролетарскай культуры.

Л.

Ліст у рэдакцыю

Прашу зьмясьціць на старонках вашай газэты наступнае:

У 22 нумары „Чырвонай Зьмены“ ад 27 студзеня г. г. надрукаваны ў літаратурнай старонцы абразок „Падпал“, над якім стаіць прозьвішча Лясны.

Каб адхіліць магчымую блытаніну, заяўляю протэст супроць выкарыстоўваньня іншымі таварышамі майго прозьвішча, пад якім я працую ў літаратуры з 1925 году.

Сябра БелАПП'у
Аркадзь ЛЯСНЫ

Паведамленьні

Усе залічаныя на курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ і Рабфакі пры БДУ, а таксама ўсе таварышы, якім прызначаны прыймовыя іспыты (калеквіумы) павінны сёньня ў 19 гадзін зьявіцца ў памяшканьне курсаў (Земляробскі завулак, былы будынак Унівэрсытэту, цяпер Даследчая Школа).

Праўленьне курсаў.

КАСТРЫЧНІКАЎСКІ РК ЛКСМБ. — Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары у памяшканьні клюбу „Ільліча“ адбудзецца кустовы сход на які павінны зьявіцца комсамольцы наступных ячэяк: „Адраджаньне“, гуты „Пролетары“, чыгуначных ячэяк, Соцвых, шчотачнай, шчацінай, каўбаснай ф-кі, БІКО, хэмікаў, войлачная, бойня, ЦІП, хімзавод, сьпіртзавод, палата мер і вагі, „Энэргія“, „Бальшавік“, „Чырвоная Зорка“, абутковая фабрыка, абутковыя майстэрні, Белкоопсаюз і НКЮ. Яўка абавязкова.

МЕН. АК ЛКСМБ

Сёньня а 6-ай гадзіне ўвечары ў памяшканьні АК ЛКСМБ адбудзецца паседжаньне конфліктнай камісіі пры АКК ЛКСМБ. Яўка сяброў конфліктнай камісіі абавязкова.

— 23 лютага а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні АК ЛКСМБ адбудзецца паседжаньне прыймовай камісіі пры АК ЛКСМБ. Яўка сяброў камісіі абавязкова.

— Заўтра а 8 гадзіне ўвечары ў памяшканьні АК ЛКСМБ—занятк курсаў акцябрацкіх работнікаў.

Прапрацоўка тэмы: „Асаблівасьці акцябрацкага ўзросту“.

Патрэбна зьявіцца таварышом якія вылучаны ячэйкамі і павадырам груп акцябрат.

АБ ЮП.

По ўсіх пытаньнях пяцідзёньніку шахматыстага і шашыстага трэба звяртацца да тав. Мазэля (Культаддзел ЦСПСБ) штодзённа ад 11 да 2-х дню і ад 6 да 8 гадзін вечару.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

ПА ТЭЛЕГРАФУ І ТЭЛЕФОНУ АД НАШЫХ КОРЭСПАНДЭНТАЎ

За зрыў ударніцтва—на чорную дошку

Спэцыялістыя лесаводы, лесаўпарадкавацелі бабруйскіх і менскіх таксацыйных партый, а таксама і ляснога кіраўніцтва НКЗБ—організавалі 13 ударных брыгад. У склад брыгад увайшло каля 100 спэцыялістых. Усе комсамольцы і комуністыя лесаводы, бяз выключэньня, увайшлі ў склад брыгад.

На першым зьлёце ўдарнікі прынялі на сябе шэраг абавязкаў па выкананьню вытворчай дысцыпліны. Там-жа прынялі пастанову аб вучоце выкананьня абавязкаў і вытворчай працы шляхам вывешваньня чорнай дошкі і дошкі тэмпаў.

Комслуж НКЗБ адмовіўся падрыхтаваць дошкі, ці адпусьціць грошы для іх закупкі. Калі ўдарнікі сунуліся ў насьценную газэту НКЗБ „Новы Шлях“ (якая паміж іншым выпускаецца ня больш трох разоў у год!), дык і там не знайшлі таго, хто-б прыняў матар'ял.

Комс уж НКЗБ зрывае ўдарны рух лясных спэцыялістых (правільны вучот працы). За гэта выносім яго першым кандыдатам на чорную дошку.

Кіраўнік штабу
брыг. НОВІКАЎ.

Замест батракоў вылучаюць пазбаўленцаў

Мы надаем зараз асабліва вялікае значэньне вылучэньню батракоў і бядняцкай моладзі на адказныя вучасткі работы ў вёсцы. Але часьцяком да вылучэньня адносяцца бюрократычна. Напрыклад, быў вылучаны на курсы старшынь коопэрацыі батрак Астрэйка Б. А. з мястэчка Пясочнае, Капыльскага раёну. Ён павінен быў ехаць у Менск, але праўленьне не забясьпечыла яго адпаведнымі дакумантамі і калі Астрэйка зьвярнуўся да старшыні коопэрацыі Чарната Платона за выпіскай з пратаколу аб яго вылучэнстве, Чарнат адмовіўся выдаць, і батрак Астрэйка застаўся дома.

Па Пясочанскім сельсавеце таксама маюцца моманты вылучэньня і на коопэрацыйную работу пазбаўленцаў, напрыклад, высунуты на працу пазбаўленец Нікановіч Максім.

Капыльскаму райкому трэба адпаведным парадкам рэагаваць на такое зьявішча.

Матыль.

Пясочнае.

ЯК РЫХТОВАЛІСЯ ДА ЧЫСТКІ

Пры Вільшчынскай ШСМ (Меншчына) група „Лёгкай Кавалерыі“ організавалася ў 1929 годзе. За кароткі час група шмат чаго зрабіла. У час падрыхтоўкі да чысткі савецкага апарату ва ўсіх бліжэйшых вёсках „кавалерыстыя“ правялі сходы сялянства, на якіх былі абгавораны пытаньні: аб барацьбе з бюрократызмам, чысткі сав. апарату і ўдзеле моладзі ў працы „ЛК“. Сходы дапамаглі ў справе выяўленьня недахопаў у працы мясцовых організацый, і збору матар'ялаў да чысткі.

ПРАЛЕЗКА.

Па тэлефону 12-19

Мы комсамолкі ячэйкі Менбуду Фрумкіна і Зільбэр уносім у фонд індустрыялізацыі краіны свае аблігацыі у агульнай суме на 55 рублёў, з іх Фрумкіна -30, Зільбэр—25 рублёў. Выклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу таварышоў Функа, Вэнзэля, Паслакевіча, Ілезера і астатніх комсамольцаў ячэйкі Менбуду.

Фрумкіна і Зільбэр.

Суд

Разгульнае жыцьцё

З таго часу, як Тодар Андрушанкаў заняў пасаду загадчыка ларка №4 Барысаўскага прыгараднага спажывецкага таварыства, характар яго вельмі зьмяніўся.

Андрушчанкаў стаў шукаць знаёмства. І вядома, жывучы у горадзе у яго хутка знайшліся „здольныя“ сябры, якія умелі ня толькі весела правесьці час, але нават пры спрыяючых момантах падкузьміць свайго „добрага“ сябра.

У большасьці Андрушчанкаў разгульваў у горадзе Нова-Барысаве, дзе зьбіраў цёплую кампанію з хлапцоў і дзяўчат і наладжваў з імі вечарынкі з выпіўкай.

У часе вечарынак Андрушчанкаў звычайна напіваўся так, што ня мог устаяць на нагах і тады даставаў з кішэні кашалёк з грашыма і крычаў:

Таварышы! Расплацецеся за выпітае і зьедзенае...

Весткі аб разгулах Андрушчанкава хутка дайшлі да райкому партыі і інш. органаў. Была зроблена праверка наяўнасьці касы ларку і налічча тавараў.

Вынікі праверкі выявілі растрату у суме 1446 р. 94 к. Так апынуўся на лаве падсудных растратчык і дэбашор Андрушчанкаў, які у свой час скончыў Харкаўскі Камвуз і зараз выкінуты з партыі.

Нарсуд г. Барысаву прыгаварыў Андрушчанкава да 5 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і да пазбаўленьня правоў на 3 гады пасьля адбыцьця пакараньня.

Д. Кастроў.

Адказны рэдактар Рэдколегія

Да тыдню вайсковай кніжкі

Клюбы, нардамы, чырвоныя куткі, вайсковыя часткі павінны папоўніць свае бібліотэкі наступнымі кніжкамі на беларускай мове:

	Стар.	Цана
А. Ісбах.—Са стрэльбай і кнігай—чырвонаармейскія будні	262	30 кап.
Б. Папоў.—Чырвоная армія і яе задачы	68	5 „
П. Ліпоўскі.—Тэрыторыяльнік на весцы	44	8 „
Н. Чупракоў.—Комсамол на дапрызыўнай падрыхтоўцы	41	10 „
А. Маліноўскі.—Жанчына і абарона	32	5 „
Н. Чупракоў.—Абавязкі пераменнага складу тэрыторыяльных войск у пэрыод паміж зборамі	44	10 „
Г. Штэрн.—Дысцыпліна ў Чырвонай арміі	44	10 „
С. Стэрлін.—Чым насельніцтва дапаможа ў часе грамадзянскай вайны	40	10 „
Д. Фурманаў.—Чырвоны дэсант—апавяданьне	72	20 „
Чаму мы перамаглі ў грамадзянскай вайне	22	10 „
А. Дзяменьцеў. М. Скурскі.—На франтох—апавяданьні	45	15 „
М. Масквін.—Падрыўнікі	64	15 „
В. Чудзінаў.—Партызан няпамятны	40	20 „
В. Юшкоў.—Выхад з бою	32	10 „
К. Варашылаў.—Сталін і Чырвоная армія	46	6 „
Пад польскім ярмом	22	10 „
М. Кашэн., К. Варашылаў, М. Літвінаў.—Замеры буржуазеі супроць СССР і мірная палітыка саветаў	109	10 „

Белдзяржвыдавецтва.

Менск, друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599